**А.А.Трусаў,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ САКРАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі да ўлады прыйшлі бальшавікі, якія адразу сталі змагацца з рэлігіяй. Пачаліся масавыя расстрэлы і арышты святароў. Знішчаліся шматлікія храмы і манастыры, была праведзена нацыяналізацыя маёмасці царквы. Усё гэта закранула і тэрыторыю Беларусі, асабліва яе ўсходнюю частку, дзе пасля Рыжскага дагавора Расіі з Польшчай у сакавіку 1921 г. была адноўлена БССР. Зачыненыя храмы і іншыя рэлігійныя будынкі сталі прыстасоўваецца новай уладай у гаспадарчых і культурных мэтах, у тым ліку і пад музеі.

Адной з першых такіх акцый было адкрыццё краязнаўчага музея ў будынку Сафійскага сабора ў Полацку. У чэрвені 1926 г. краязнаўцы Полацка здолелі разгарнуць экспазіцыю ў інтэр’ерах Полацкай Сафіі. Будынак быў перададзены пад музей Полацкім акружным выканкамам, які штогод выдзяляў на музейныя работы 1000 рублёў. Экспазіцыя падзялялася на тры аддзелы:

– культурна-гістарычны з двума пададдзеламі: мастацкім і нумізматыкі;

– грамадска-эканамічны, прысвечаны этнаграфіі Полаччыны;

– прыродна-геаграфічны, дзе былі чучалы звяроў, гербарыі і ўзоры мясцовай глебы.

Музей працаваў тры дні ў тыдзень, з 10 да 16 гадзін. У год яго наведвалі каля 5 тыс. чалавек.

Пасля аб’яднання некалькіх асобных аршанскіх музеяў на працягу 1928–1929 гг. новую экспазіцыю адкрылі ў будынку былой царквы на вул. Энгельса.

7 лістапада 1927 г. на першым паверсе былой Мінскай архірэйскай царквы адкрыўся заалагічны музей Інстытута беларускай культуры. Толькі за першыя паўтара месяца яго наведалі каля 5 тыс. чалавек з Мінска і бліжэйшых вёсак. Асаблівую ўвагу наведвальнікаў прыцягвала чучала зубра. Аднак ужо ў пачатку 1930 г., калі распачаліся рэпрэсіі, СНК БССР выселіў Беларускі дзяржаўны музей з будынка архірэйскага падвор’я, як і

заалагічны музей Інбелкульта. Абодва музеі перавялі ў маленькае памяшканне Дома селяніна.

У 1934 г. І.С.Мігулін, дырэктар Магілёўскага краязнаўчага музея, каб ўратаваць ад разбурэння славуты Іосіфаўскі сабор, помнік архітэктуры класіцызму XVIII ст., стварыў у ім філіял свайго музея пад назвай Музей рэлігіі і атэізму. Акрамя рэчаў хрысціянскага культу тут былі выстаўлены археалагічная і палеанталагічная калекцыі, у тым ліку і адзіны ў БССР шкілет маманта. Аднак у 1938 г. музей перавялі з будынка царквы ў будынак былой сінагогі, а унікальны сабор узарвалі.

Яшчэ адзін падобны антырэлігійны музей як філіял Віцебскага сацыяльна-гістарычнага музея быў адкрыты ў маі 1940 г. у будынку Антоніеўскага касцёла.

Пасля вайны ў адпаведнасці з пастановай СНК БССР Абласны краязнаўчы музей у Полацку павінен быў аднавіць дзейнасць 6 лістапада 1948 г. у будынку Сафійскага сабора.

У 1953 г. было створана Міністэрства культуры БССР з асобным аддзелам музеяў і помнікаў. У маі міністэрства прыняло “Палажэнне аб раённым краязнаўчым музеі”, што павысіла статус музея і дазволіла шукаць і прыстасоўваць пад музеі розныя будынкі, у тым ліку і культавыя.

У 1957 г. адкрыўся Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, першая экспазіцыя была разгорнута ў былым касцёле. У гэты час існаваў і Полацкі раённы краязнаўчы музей у невялікім будынку былой лютэранскай кірхі, але да 1968 г. ён меў экспазіцыю толькі па савецкім перыядзе.

Значны зрух у музеефікацыі сакральных будынкаў адбыўся ў другой палове 60-х гг. У 1966 г. было створана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, з’явіліся першыя архітэктурна-археалагічныя запаведнікі ў Полацку і Заслаўі. У іх склад увайшлі і асобныя сакральныя помнікі архітэктуры.

23 кастрычніка 1973 г. быў заснаваны Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі. Яму вылучылі спачатку памяшканне ў Полацкім Сафійскім саборы. У 1977 г. музей перавялі ў г. Гродна ў былы базыліянскі кляштар. У гэты час яго дырэктарам быў прызначаны вядомы беларускі пісьменнік Аляксей Карпюк. Першая экспазіцыя музея была адкрыта ў будынку кляштара ў студзені 1985 г. Аднак у 1991 г. дзейнасць музея надоўга прыпынілася, калі абласныя ўлады гвалтоўна выселілі музей у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непадрыхтаваныя памяшканні, а адноўлены кляштар разам з будынкам царквы перадалі праваслаўнай царкве пад жаночы манастыр.

У 1981 г. скончылі рэстаўрацыю былога Богаяўленскага сабора XVIII ст. у Полацку і адкрылі там карцінную галерэю як складовую частку Полацкага запаведніка.

Наступны па часе музей, які адыгрываў у запаведніку дамінантную ролю, адкрыўся ў 1987 г. у Сафійскім саборы і быў прысвечаны яго гісторыі і архітэктуры. Экспазіцыя Музея гісторыі і архітэктуры Сафійскага сабора размяшчалася ў дзвюх залах і ахоплівала храналагічны перыяд з сярэдзіны XI ст. да нашых дзён. Арганічнай часткай экспазіцыі з'яўляліся фрагменты сцен сабора, якія паказвалі ход рэстаўрацыйных работ у 1969–1983 гг. Акрамя музея, у Сафійскім саборы з 1985 г. дзейнічае арганная канцэртная зала. У музейную экспазіцыю ўключаны раней невядомыя рэшткі храма XI ст., знойдзеныя археолагамі ў час раскопак (ніжняя зала). Агульная плошча экспазіцыі 870 кв.м. Экспанаты размешчаны ў дзвюх залах – верхняй і ніжняй.

У 1990 г. у будынку былой брацкай школы пачаў дзейнічаць Музей беларускага кнігадрукавання, у чатырнаццаці залах якога экспанаты згрупаваны па наступных раздзелах: развіццё пісьменства, формаў і матэрыялаў кнігі; рукапісная кніга на беларускіх землях; жыццё і дзейнасць Ф.Скарыны; Скарыніяна; кнігадрукаванне другой паловы XVI–XVIII ст., XIX – пачатку XXст.; гісторыя кніжнай ілюстрацыі; тыпы і віды друкаванай прадукцыі; развіццё паліграфіі.

У 1976–1978 гг. быў адноўлены будынак былога касцёла XIX ст. у в. Раўбічы Мінскага раёна побач з алімпійскім спартыўным комплексам. У 1979 г. у ім адкрылі Музей беларускага народнага мастацтва. Асноўны фонд музея (2008) налічвае 424 адзінкі захавання. Агульная плошча экспазіцыі 283 кв.м. Пастаянная экспазіцыя музея размешчана ў вялікай зале і дзвюх прыбудовах (прытворах), у якіх паводле архіўных матэрыялаў адноўлены архітэктурныя дэталі будынка і малюнак аконных рам. Экспазіцыя складаецца з раздзелаў: традыцыйнае мастацтва XVIII – першай паловы XX ст. і сучаснае – з 1960 г.

У 1978 г. у будынку былой Спаса-Праабражэнскай царквы (першапачаткова кальвінскі збор) XVI ст. быў адкрыты Заслаўскі музей рамёстваў і народных промыслаў. З 1986 г. гэты музей уваходзіў у склад Заслаўскага гісторыка-культурнага запаведніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульная плошча 347 кв.м. Дзве выставачныя залы. Матэрыялы першай залы знаёмілі з гісторыяй Беларусі, меліся выявы старажытных гербаў беларускіх гарадоў, якія атрымалі Магдэбургскае права. У экспазіцыі другой залы было прадстаўлена больш за 900 твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і народных рамёстваў Х – пачатку ХХ ст., у тым ліку знойдзеныя пры археалагічных раскопках. Музей расфарміраваны ў сувязі з перадачай храма праваслаўнай абшчыне. Большая частка экспанатаў захоўваецца ў фондах Нацыянальнага музея Беларусі.

Пасля 1989 г. прыстасаванне былых сакральных будынкаў у СССР і БССР пад музеі і іншыя ўстановы культуры спынілася, і неўзабаве некаторыя будынкі з музейнай экспазіцыяй былі перададзены вернікам.

1. *Адраджэнне:* альбом. – Віцебск, 2000.
2. *Гужалоўскі, А.А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 176 с.
3. *Гужалоўскі, А.А.* Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2004. – 218 с.
4. *Музеі* Беларусі. – Мн.: БелЭн, 2008. – 559 с.
5. *Полацк* музейны: фотаальбом. – Мн.: Беларусь, 2006. – 283 с.
6. *Слюнченко, В.Г.* Полоцкий Софийский собор: историко-архитектурный очерк / В.Г.Слюнченко. – Мн.: Полымя, 1987. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ